НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

№ 22 (112), СНЕЖАНЬ 2010 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

# АГОНІЯ, АБО РАЗВІТАННЕ З "БАЦЬКАМ"

Трагікамічны фарс пад назвай "выбары прэзідэнта" завершыўся. Як і заўжды, кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка разам са старшынёй ЦВК Лідіяй Ярмошынай намалявалі ў выніковых пратаколах звыклую для сябе лічбу перамогі –79, 65% (у нашым раёне – 88, 12% ). Планка яўкі выбаршчыкаў таксама не знізілася ў параўнанні з мінулай выбарачай кампаніяй па раёну – 95,2 %. Бадай, самае адметнае ў прэзідэнцкай кампаніі было тое, што рэжым вырашыў пагуляць у лібералізацыю і зарэгістраваў дзесяць кандыдатаў на месца кіраўніка краіны. Пры гэтым уладу трымаючыя разлічвалі, што апазіцыйны рух будзе размыты ўнутранымі рознагалоссямі сярод электарату, акрамя таго, асабістыя амбіцыі дэмакратычных лідэраў зробяць іх статыстамі кампаніі на фоне "моцнага правадыра". Але, як казаў адзін вядомы расейскі прэм'ер-міністр, – хацелі як лепш, а выйшла, як заўсёды. Атрымалася ўсё наадварот: сцэнар аднаго рэжысёра ганебна праваліўся, і горш за ўсё было тое, што правадыр паламаў яго сам. Выкарыстоўваючы прамы эфір БТ, альтэрнатыўныя кандыдаты выказалі ўсю праўду пра тое беззаконне, што робіцца ў краіне вертыкальшчыкамі ўлады, а Лукашэнку абвінавацілі ва ўсіх смяротных грахах. Гледзячы на смелыя выступленні дэмакратычных лідэраў, нават махровыя лукашысты сярод пенсіянераў былі шакіраваны. Асабіста я быў здзіўлены тым фактам, што мяне, як ужо "прафесійнага апазіцыянера" уключылі ў выбарчую камісію на ўчастак № 15 у аграгарадку Амбросавічы. Напэўна прапусцілі таму, што ўчастак невялікі, яго кантынгент складаюць у асноўным пенсіянеры ды калгаснікі мясцовага сельгаспрадпрыемства "Прыазёрны". У спіс для галасавання было ўнесена 335 чалавек. Трэць выбаршчыкаў галасавалі датэрміна. Без сумневу, галасаванне было прымусовае. Калгаснікам выдавалі палучку ў касе, якая была размешчана насупраць выбарчага ўчастка. Атрымаўшы грошы, вяскоўцы з пашпартамі заходзілі на ўчастак і заадно атрымоўвалі выбарчыя бюллетэні. Праўда, знайшлася адна смелая спадарыня, якая абуралася, што з самай раніцы ей тэлефануе начальніца і патрабуе наведаць ўчастак. Аднак пратакол аб парушэнні заканадаўства яна падпісаць адмовілася – працоўны люд заняволены кантрактнай сістэмай. 19 снежня, у дзень галасавання прыйшло ўсяго 90 выбаршчыкаў, а 111 бюллетэняў павезлі на дом. Дарэчы, за цэлы тыдзень паступіла ў камісію толькі адна пісьмовая заява ад выбаршчыка, які прасіў арганізаваць галасаванне на даму. Не было і тэлефонных званкоў. Вынікае, што і гэта форма галасаваня была прымусовая. А людзі ў аддаленых вёсках пра гэта наогул не ведалі, ні старыя, ні маладыя. Дзесяцігоддзямі вясковых жыхароў прывучалі да такой завядзёнкі: калі выбаршчык пражывае не на цэнтральнай сядзібе, то гэта азначае, што бюллетэнь члены камісіі заўсёды павінны везці на дом. Многія не чакалі візіцёраў: неахвотна злазілі з печы. Адзін дзядзька з раніцы пайшоў на рыбу, а машыну пасылалі два разы, каб яго знайсці. Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што старшыня камісіі (дырэктарка мясцовай СШ) усе ж такі адважылася на адкрыты падлік галасоў. Загадзя былі падрыхтаваны таблічкі з прозвішчамі кандыдатаў, каля якіх складалі ў купкі адпаведныя бюллетэні. Вынік быў прадказальны – за Лукашэнку аддалі свае галасы звыш 280 выбаршчыкаў, за апазіцыянераў каля дваццаці, супраць усіх ¬– пяць галасоў. Рэшта – звыш дваццаці чалавек на выбары не прыйшла. Для занядбанай сельскай глыбінкі паказчыкі зусім нядрэнныя: каля паўсотні людей цвярозага розуму набярэцца і хопіць. Паводзіны астатніх – гэта ўжо не палітычны выбар, а праявы маральнай дэградацыі асобы. Якая тут можа быць палітыка, калі толькі за адзін тыдзень жыхары маленькай вёскі выпілі 800 літраў вінна-гарэлачнага сурагату? Адпітыя мазгі нараджаюць пачвараў. Яшчэ раз пераканаўся ў гэтым, калі пасля выбараў прагледзеў інтэрнэт. Не паверыў сваім вачам: азвярэлыя спецназаўскія карнікі палявалі за людзьмі на вуліцах Менску. Даганялі ўсіх без разбору: жанчын, дзяўчат, старых і малых. Валілі на зямлю, збівалі дубінамі, рукамі, нагамі і шчытамі да непрытомнасці, да крыві, ад якой чырванеў снег. Навідавоку агонія – рэжым зайшоў у тупік, пачалося яго самаразбурэнне. Гэта было бачна і па паводзінах калгаснікаў, якія галасавалі за Лукашэнку. Хаця з памяшкання клуба неслася расейская папса, але на тварах вяскоўцаў не было і прыкмет весялосці. Панурыя людзі моўчкі бралі бюллетэнь, апускалі ў скрыню і адыходзілі з апушчанай галавой, нібыта іх вялі ў палон. Ніхто не браў з сабою дзяцей, не рабіў фотаздымкаў. Увогуле, было такое адчуванне, што сярод залі стаяла не скрыня для галасавання, а труна з целам нябожчыка, з якім развітваюцца ў апошні раз. Здаецца, што 19 снежня не дэмакратыю пахавалі, а канчаткова пахавалі лукашысты свайго правадыра, якому і самі ў глыбіні душы даўно не вераць.

**Аляксандр Шчамлёў.**

# НА СЕЛЕКТАРНАЙ НАРАДЗЕ

21 снежня старшыня Шумілінскага райвыканкама В. А. Падляшчук праводзіў селектарную нараду са сваімі падначаленымі. Кіраўнік раёна становча ацаніў ход выбарнай кампаніі, ухваліў дзейнасць адказных асоб, якія своечасова "даставілі" народ на ўчасткі для галасавання. Пры гэтым Вальдэмар Антонавіч адзначыў, што выбары праходзілі ў спакойнай абстаноўцы, без парушэнняў выбарачага Кодэксу. Па ўсяму відаць, што кіраўнік райвыканкама застаўся задаволены вынікамі выбараў у нашым раёне і падзякаваў усіх начальнікаў на месцах, якія забяспечылі высокую яўку выбаршчыкаў на ўчасткі. На парадак дня былі вынесены і іншыя злабадзённыя пытанні, якія тычыліся расчысткі дарог, пажарнай бяспекі, забяспячэння насельніцтва цвёрдым палівам. Асаблівы ўпор быў зроблены на стан дарог. Такая ўвага з боку раённых начальнікаў зразумелая –няма больш каштоўнасці, чым чалавечае жыццё. І ў нашым раёне на дарогах нярэдка гінуць людзі. Таму трэба пастаянна клапаціцца аб своечасовым рамонце дарог, расчысткі ад снегу, не дапускаць галалёду. Каб іншы раз дарожныя зводкі не нагадвалі зводкі з франтоў.

**Я. Вайтовіч.**

# Самаадданасць роднай мове

Па традыцыі ў нашым раёне, як і па ўсёй Беларусі два разы ў год выбіраюць лепшага настаўніка. Аднак першы этап па выбары лепшага настаўніка пачынаецца ў школах. Педагогі праходзяць нялёгкія іспыты, каб трапіць спачатку на раён, потым на вобласць.Стаць пераможцам няпроста. Неабходна дасканала ведаць тэорыю педагогікі і дыдактыкі, быць сапраўдным асам ў сваім прадмеце, карыстацца аўтарытэтам у калег, павагай вучняў. А яшчэ трэба мець артыстычныя здольнасці, валодаць сучаснай інфармацыйнай тэхнікай, наогул мець сваю адметнасць, каб даказаць усім і, напэўна, сабе, што можаш быць настаўнікам, як кажуць, ад бога. Менавіта такія якасцямі валодалі тыя педагогі, якія ўдзельнічалі ў кокурсе. А падвядзенне вынікаў конкурсу "Настаўнік года" праходзіла ў Язвінскай базавай школе. Чатыры педагогі, чатыры настаўнікі змагаліся за ганаровае званне. В. М. Іванова, настаўнік вышэйшай катэгорыі, амаль тры дзесяцігоддзі выкладае рускую мову і літаратуру. Навучыць дзяцей разумець слова, адкрыць для іх скарбонку сусветнай літаратуры – галоўная задача для педагога.І. У. Залатарова выкладае ў школе нямецкую мову. Перакваліфікацыю прайшла параўнальна нядаўна, але педагагічны стаж ужо даволі вялікі і выніковы.Настаўніцу фізкультуры А. У. Караленка добра ведаюць у раёне. Яе любяць вучні, паважаюць калегі. Напэўна, ніводнае спартыўнае мерапрыемства не абыходзіцца без яе вучняў і іх перамог. Аўтарытэт Н. А. Каротчанка на вышэйшым узроўні не толькі сярод калег–беларусазнаўцаў, але і сярод усяго педагагічнага калектыву раёна. Самаадданасць працы, роднай мове выклікаюць захапленне і павагу.Педагогі-канкурсанты на працягу тыдня давалі адкрытыя ўрокі, прапаноўвалі ўласныя сістэмы навучання, дыдактычныя матэрыялы. Яны адказвалі на тэарэтычныя пытанні і паказвалі свае візіткі. Пераможцай названа Надзея Аляксандраўна Каротчанка. Яна атрымала грамату і прэмію. Астатнія ўдзельнікі сталі лаўрэатамі конкурсу і таксама атрымалі матэрыяльнае заахвочванне.

**Алесь Прыбярэжны.**

# БЮДЖЭТ ЗАЦВЕРДЖАНЫ. АДНАГАЛОСНА

Дэпутаты Шумілінскага раённага Савета сабраліся на чарговую сёмую сесію. Сесія заслухала справаздачу вядучых спецыялістаў раённага выканаўчага камітэта па аналізу работы эканомікі раёна ў 2010 годзе. Намеснік старшыні райвыканкама В. А. Байда зачытала прысутным даклад, у якім былі прыведзены паказчыкі сацыяльна-эканамічнага становішча раёна. Паводле афіцыйных дадзеных, расходная частка бюджэту за 2010 год склала 51,8 мільярдаў рублёў. Зацвярджаючы бюджэт на 2011 год, удзельнікі сесіі задавалі пытанні старшыні абласнога Савета А. Я. Ацясаву. Аляксанр Ягоравіч запэўніў шумілінскіх кіраўнікоў, што нашаму раёну будзе, як і ў мінулым годзе, аказана значная фінансавая дапамога. Грошы патрэбны на рэканструкцыю будынка Дабейскага сельскага Савета, на завяршэнне рамонту школы мастацтваў. У ходзе абмеркавання праекта бюджэту на 2011 год высвятлілася, што ён мае сацыяльную накіраванасць. З сумы ў 62,1 мільярда рублёў 77% расходаў запланавана на невытворчую сферу. Напрыклад, толькі 43% усіх расходаў будзе выдзелена на галіну адукацыі. Разам з тым нямала сродкаў прадугледжана на жыллёва-камунальную сферу, рэканструкцыю камунікацый, будаўніцтва, аграпрамысловы комплекс. Аднак для выканання прагнозных паказчыкаў неабходна забяспечыць рост аб'ёму вытворчасці прамысловай прадукцыі на 13 адсоткаў аграрыям раёна ¬– на 9 адсоткаў. Бюджэтная сістэма не павінна знаходзіцца ў статычным стане. Дэпутаты пагадзіліся з усімі праграмамі і прынялі бюджэт аднагалосна.

**С. Горкі.**




## "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале http://kamunikat.org/, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: http://kamunikat.org/svitanak.html , што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

## АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя « Світанка » змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – наша падзяка. Словам, сувенірам.***

# Новая гандлёвая кропка

Апошнім часам на Шуміліншчыне было адкрыта некалькі аб'ектаў розных форм уласнасці. Што, безумоўна радуе нашых жыхароў. У суботу 18 снежня ў райцэнтры адбылася падзея: гасцінна расчыніў дзверы для пакупнікоў магазін "Алімп". І вось кіраўнік раёна В. А. Падляшчук урачыста перарэзаў першую стужку, няспешна прайшоў па гандлёвай зале, што вабіла вока разнастайнымі прадуктамі. Першае ўражанне, якое пакінуў магазін, сюды абавязкова трэба вярнуцца. Ён прапануе даволі шырокі асартымент прадуктаў – мясныя, малочныя, хлебабулачныя, кандытарскія. Зразумела, вярнуцца за пакупкай больш зручна будзе жыхарам, што пражываюць у мнагалюдным мікраараёне, на вуліцы Першамайскай, 70 год БССР і Суворава. На будаўніцтва новага магазіна і сучаснага абсталявання было выдзелена 310 рублёў. На прыкладзе "Алімпа" мясцовае кіраўніцтва плануе даказаць, што падобныя праекты хутка акупаюцца. Найперш паток пакупнікоў будуць абслугоўваць шэсць прадаўцоў з васьмі гадзін раніцы да дзесяці вечара. Па-другое, укаранёны прагрэсіўныя метады разліку. Кожны тавар сканіруецца на касе, і, такім чынам, выключаецца падман пакупніка. Так што, кіраўніцтва спажывецкай кааперацыі спадзяецца, наведвальнікі застануцца задаволенымі.

**Я. Вайтовіч.**

# САМЫ ПАПУЛЯРНЫ МАГАЗІН

Беларускі спажывец, у адрозненні ад заходняга, не надта распешчаны ўвагай вытворцаў. Асабліва ў фірменных магазінах. Прынамсі, у шумінскіх крамах вельмі складана знайсці вітрыны магазінаў з яркімі рэкламамі аб скідках на тавары паўсядзеннага попыту. Але , як паказала практыка, пакупнікоў прыцягваюць прымальныя цэны і высокая якасць прадукцыі, асабліва на мясныя прадукты. Тым больш, што яны прадаюцца ў невялікіх магазінах, кірмашах выхаднога дня, прадпрыемствамі фірменнага гандлю. Віцебская бройлерная птушкафабрыка мае сетку магазінаў па ўсёй вобласці. У красавіку мінулага года ў нашым райцэнтры на вуліцы Ленінскай з'явіўся спецыялізаваны магазін "Ганна".'За паўтара года работы работнікі магазіна паспелі вывучыць попыт і густы пакупнікоў. У іх дружны калектыў. Добра працуюць Любоў Бяляева, Наталля Лапатнёва і іншыя прадаўцы. "Ганну" шумілінцы палюбілі. У будні краму наведваюць каля тысячы пакупнікоў, а ў пятніцу і суботу – у паўтара раза больш. Людзям падабаецца прадукцыя, якую завозяць у магазін. І сапраўды, у Шуміліне не знойдзеш чалавека, які б не ведаў магазін "Ганна". А пасля рабочага дня тут нават збіраюцца чэргі. Прычым, ва ўсе тры аддзелы – ахалоджанай прадукцыі, гатовай і кандытарскай. Толькі паўфабрыкатаў хуткага прыгатавання налічваецца каля дзвюх дзесяткаў відаў. Асабліва карыстаюцца попытам "гостинец деревенский", "купаты селянские", "ножка в дорожку". Добра разбіраюць ахалоджанае мяса птушкі. Людзі ацанілі якасную і параўнальна недарагую прадукцыю. Спецыялісты фабрыкі пастаянна аднаўляюць асартымент, і пакупнікі ахвотна купляюць навінкі – "фарш катлетны", каўбасы "здароўе", "мартадэла", шніцаль "сытный" і "лакомый" са смакам белага грыба.У аддзеле гатовай прадукцыі – дзве вітрыны шчыльна закладзены рознымі гатункамі каўбас, сардэлек, сасісак,рулетаў.Прадстаўлены і шырокі асартымент іншых харчовых тавараў айчыннай вытворчасці. Прычым, сыр і сметанковае масла – шумілінскага сырзавода. Магазін "Ганна" супрацоўнічае і з хлебазаводам, "Вежай" і "Славянскім продуктам". Кандытарскі аддзел наведваюць у асноўным жанчыны з дзецьмі. Цэлую вітрыну тут займаюць торты, якія штодзень прывозяць. А да Новага года ў магазіне праводзіцца спецыяльная рэкламная акцыя. Пры пакупцы тавараў больш як на 70 тысяч рублёў у падарунак пакупнік атрымае фольгу ці рукаў для запякання. У магазіне вы купіце ўсё да навагодняга стала". Дарэчы, магазін "Ганна" працуе з васьмі гадзін раніцы без выхадных.

**С. Горкі.**

# СЕЗОН СПАРТОВАГА ДЭФІЦЫТУ

Аматары зімовага адпачынку на Шуміліншчыне могуць пакатацца толькі на ўласных лыжах, каньках і санках. Галоўным месцамі, дзе збіраюцца аматары актыўнага адпачынку, з'яўляецца каток каля спартыўнай школы і яшчэ адзін на тэрыторыі СШ № 1. Праўда, у аддзеле фізічнай культуры, спорту і турызму райвыканкама зноў заверылі, што ў бліжэйшыя дні будзе заліты каток і ў Верхнім горадзе. Дарэчы, тут устаноўлена і хакейная каробка.Багата моладзі катаецца як на катку каля СШ №1, так і каля спартшколы. Месца хапае, каткі пастаянна расчышчаюцца. А вось наконт пракату, які арганізавалі ў аддзеле фізічнай культуры, спорту і турызму райвыканкама, ёсць пытанні. І яны, дарэчы, узнікаюць ужо не першы год.Найперш па каньках, не хапае малых памераў. Вось і прыходзіцца аматарам канькоў прыходзіць да адкрыцця пракату, каб узяць дэфіцытную пару. Дарэчы, новыя канькі з'явіліся ў пракаце толькі дзякуючы спонсарскай дапамозе Нацыянальнага алімпійскага камітэта: падарылі восем пар канькоў і тры пары ролікаў для дзяцей дзетсадаўскага ўзросту. А вось з пракатам лыж сітуацыя лепшая. У аддзеле фізічнай культуры, спорту і турызму райвыканкама можна выбраць любую пару. Пракатам лыж займаецца і камбінат бытавога абслугоўвання. Мінулагодняя зіма паказала, што большасць лыж знаходзіцца ў пункце пракату ў аграгарадку Светласельскі – людзі з задавальненнем адпачываюць у сасонніку. Яшчэ адзін варыянт. Набыць канькі, лыжы альбо санкі можна ў краме. І мець усё ўласнае. У магазіне "Усё для дома" сустрэлі зіму багатым асартыментам тавараў для актыўнага зімовага адпачынку. Тут ёсць і канькі, і лыжы, і санкі, і "навінка сезона" – санкі-лядзяшкі. Канькі і лыжы ёсць у продажы як для дзяцей, так і для дарослых. Па словах прадаўцоў магазіна, сёлета лыжы, санкі і канькі карыстаюцца попытам у пакупніка.

**У Арэшкін.**

# САМАЯ ПРАДСТАЎНІЧАЯ ГРАМАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

У Шумілінскім раёне па ініцыятыве выканаўчай улады створаны і дзейнічае 21 грамадская арганізацыя. Адной з самых прадстаўнічых з'яўляецца раённая арганізацыя Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. 14 снежня ў райвыканкаме адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя. На мерапрыемства дэлегаты прымалі справаздачу аб рабоце за мінулую пяцігодку, быў абраны актыў арганізацыі. Акрамя таго, удзельнікі канферэнцыі вылучылі дэлегатаў на абласную канферэнцыю. У якасці гасцей на мерапрыемстве прысутнічалі кіраўнікі і галоўныя спецыялісты розных службаў раёна. Былі запрошаны намеснік старшыні райвыканкама А. М. Зайцаў, галоўны ўрач ЦРБ К. Ф. Баканаў, спецыяліст абласной арганізацыі Д. А. Рачкоўскі і іншыя адказныя асобы.Трэба сказаць, што на ўліку ў арганізацыі 4280 чалавек (аб'яднаных у 100 пярвічак), людзей, з якіх у добраахвотна-прымусовым парадку ўтрымліваюць з заработнай платы грошы на дабрачыннасць. Летась у наш раён паступіла гуманітарнай дапамогі больш чым на 18 мільёнаў рублёў. Пры гэтым 973 сацыяльна неабароненыя грамадзяне атрымалі адзенне, канцылярскія тавары і многае іншае. Абласны госць, кіраўнік таварыства Чырвонага Крыжа Дзмітры Рачкоўскі прапанаваў на старшынства Валянціну Чыжыкаву, і делегаты пагадзіліся без абмеркавання. Як заўважыў старшыня прэзідыума таварыства Канстанцін Баканаў, на Шуміліншчыне вядзецца планамерная праца па распаўсюджванню ведаў аб міжнародным гуманітарным праве сярод моладзі. Спецыяльны курс па гэтай тэме чытаецца ў некаторых школах раёна. Валанцёры арганізацыі Чырвонага ў розных формах выхоўваюць школьнікаў для гуманнага грамадства. Рэгулярна праводзяцца конкурсы, віктарыны, акцыі, выставы. У сваю чаргу старшыня арганізацыі В. М. Чыжыкава выказала надзею на паразуменне з працоўнымі калектывамі тых арганізацый і прадпрыемстваў, дзе пярвічкі Чырвонага Крыжа дагэтуль не створаны. На заканчэнне мерапрыемства найбольш актыўным валанцёрам былі ўручаны прызы і падарункі.

**Алесь Прыбярэжны.**

# КІНО ВЯЗУЦЬ НА ВЁСКУ

Напэўна не засталося ў раёне ніводнай сям'і, дзе не было б тэлевізара, відэаплэера, або кампутара з доступам у Інтэрнэт. Часам здаецца, што такі від абслугоўвання насельніцтва, як дэманстрацыя кінафільмаў у дамах культуры адыйшоў у мінулае. Шмат дзе на вёсках можна пабачыць пустуючыя сельскія клубы, ды і ў раённым кіназале гледачоў бывае нямнога. І ўсё ж нягледзячы на новыя павевы часу, кіно ў шумілінцаў па-ранейшаму яшчэ карытаецца попытам. Прадпрыемства "Шумілінская кінавідэасетка" і зараз радуе гледачоў. Сёння ў кінавідэапрадпрыемстве ёсць стабільная матэрыяльная база, працуе шэсць кінавідэакропак – чатыры ў аграгарадках Слабада, Башні, Светласельскі і Амбросавічы, дзве – у Шуміліне і Обалі. Астатнія аграгарадкі абслугоўвае аўтамабільная кінавідэаўстаноўка. Сеансы праходзяць як мінімум два разы на тыдзень. Прычым, паказы разлічаны як на дарослую, так і на дзіцячую аўдыторыю. Наладжана цесная сувязь з раённым аддзелам адукацыі: вучням прапаноўваюць і навукова-папулярныя, і розныя стужкі па школьных праграмах. Радуе сітуацыя ў аграгарадку Мікіціха. Тут людзі з задавальненнем ідуць у кіно. Шмат гледачоў прыйшло на прэм'ерны паказ мастацкай стужкі "Ваўкі" вытворчасці "Беларусь-фільм", багата гледачоў сабраў і "Гладыятар". Так што ў Мікіцісе цалкам верагодна, што стацыянарная кінавідэакропка з'явіцца ў наступным годзе. Планаў у прадпрыемства багата. Найперш, гэта рэканструкцыя кіназалы ў Шуміліне. Безумоўна, 3D верне і ў райцэнтры гледачоў у кіназалу. Праўда, пакуль што гэта планы на перспектыву.

**Алесь Шумскі.**

# РЫНАК ЗБЫТУ ПАШЫРЫЎСЯ

З пачатку года ў вытворчым цэху ААТ "Малако" вырабілі 2279 тон сыру і 401 тону масла. Цяпер тут занята больш за паўтары сотні работнікаў. За адны суткі перапрацоўваюць каля ста тон малака, з якога вырабляюць 8-9 тон сыру і 2 тоны сметанковага масла." На сырзаводзе адзначылі, што апошнім часам з гаспадарак раёна паступае больш якаснае малако. Каля 30% малака ідзе "экстраклас". Менавіта з яго атрымліваюцца якасныя сыры. Але не хапае аб'ёмаў для перапрацоўкі. Напрыклад, за студзень-лістапад гаспадаркі раёна паставілі на завод толькі 26% ад агульнай колькасці паступіўшага малака. А гэта для завода дадатковыя выдаткі. Каб не вазіць малако з іншых раёнаў і каб не толькі шумі-лінскі цэх забяспечыць сыравінай, у раёне мяркуюць будаваць яшчэ жывёлагадоўчыя комплексы. Дарэчы, у гэтым годзе ў вытворчым цэху сталі выпускаць новыя гатункі сыроў. Ужо з'явіліся ў магазінах раёна і вобласці сыр "стараславянскі", "расійскі новы" і "каралеўскі". Шумілінскі сыр прадаецца па ўсёй рэспубліцы. Сёлета, напрыклад, 625 тон сыру пайшло на ўнутраны рынак. Любяць шумілінскі сыр і ў Расіі – яго заказваюць гандлёвыя базы Масквы, Пскова, Чалябінска, Растова-на-Доне. У гэтым годзе на экспарт пайшло 1475 тон сыру на 7,5 мільёна долараў (летась выручка склала 5,8 мільёна долараў). Расіяне даваряюць смаку і якасці сыру, што вырабляюць у Шуміліне.

**Алесь Шумскі.**

# ЗША і ЕС: Беларускі народ заслугоўвае лепшай долі

***Сумесная заява дзяржаўнага сакратара ЗША Хілары Клінтан і Высокага прадстаўніка Еўрапейскага Саюза Кэтрын Эштан аб сітуацыі пасля выбараў прэзідэнта ў Рэспубліцы Беларусь.***

Злучаныя Штаты Амерыкі і Еўрапейскі Саюз яшчэ раз заклікаюць да неадкладнага вызвалення ўсіх кандыдатаў у прэзідэнты і больш за 600 дэманстрантаў, затрыманых пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.

Мы рашуча асуджаем ўсякую праяву гвалту, у асаблівасці непрапарцыйнае прымяненне сілы ў дачыненні да кандыдатаў у прэзідэнты, палітычных актывістаў, прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і журналістаў.

І выбары, і падзеі, што паследавалі за імі, з'яўляюцца крокам назад у развіцці дэмакратычнага кіравання і павагі правоў чалавека ў Беларусі. Беларускі народ заслугоўвае лепшай долі.

Еўрапейскі Саюз і Злучаныя Штаты Амерыкі адзначаюць сур'ёзныя праблемы ў выбарчым працэсе і падліку галасоў, што было адлюстравана ў справаздачы місіі назіральнікаў ад АБСЕ, і настойліва заклікаюць урад Беларусі да выканання ўзятых на сябе абавязацельстваў у рамках АБСЕ па істотным рэфармаванні выбарчага працэсу. Ураду Беларусі таксама неабходна зрабіць крокі па забеспячэнні поля дзейнасці для палітычных актывістаў, прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і незалежных журналістаў.

Павага дэмакратыі і правоў чалавека па-ранейшаму займаюць цэнтральнае месца ў пытанні паляпшэння адносін Беларусі з ЗША і Еўрапейскім Саюзам. Без значнага прагрэсу ў гэтых абласцях не адбудзецца паляпшэння адносінаў. Менавіта ў такім кантэксце мы будзем ацэньваць дзеянні ўрада Беларусі па вырашэнні сітуацыі прымаць пад увагу развіццё падзей пры разглядзе нашых адносін з Беларуссю. Еўрапейскі Саюз і Злучаныя Штаты маюць намер працягваць падтрымку і ўзаемадзеянне з народам Беларусі і прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці.



# АБСЭ НЕ ПРЫЗНАЕ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ СВАБОДНЫМІ І ДЭМАКРАТЫЧНЫМІ

***Выбары ў Беларусі нельга прызнаць свабоднымі і дэмакратычнымі, заявіў на прэс-канфэрэнцыі ў панядзелак у Менску кіраўнік місіі часовых назіральнікаў Бюро дэмакратычных працэдураў і правоў чалавека АБСЭ Тоні Лойд.***

«Беларусі яшчэ трэба будзе прайсьці вялікі шлях, каб выконваць свае абавязкі ў рамках АБСЭ», — заявіў Лойд. Агульны ход галасаваньня атрымаў станоўчую ацэнку назіральнікаў. Аднак сытуацыя пагоршылася ў часе падліку галасоў. «Дрэнную» ці «вельмі дрэнную» адзнаку атрымала практычна палова ўчасткаў.

Лойд: «Выбары не змаглі даць Беларусі таго новага пачатку, якога яна вартая». Ён падкрэсьліў, што «арышты кандыдатаў у прэзыдэнты і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці і грубы разгон дэманстрацыі будуць тым падмуркам, на падставе якога будуць ацэньвацца дадзеныя выбары».

Вечар выбараў быў азмрочаны затрыманьнем практычна ўсіх кандыдатаў, а таксама сотняў удзельнікаў вулічнай акцыі, заявіў Лойд. Лойд сказаў, што чакае адказу ўраду Беларусі на арышт удзельнікаў акцыі.

**Алесь Дашчынскі.**

# МІНІСТР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ПОЛЬШЧЫ: ЛУКАШЭНКА НАБРАЎ 40%

Спасылаючыся на крыніцы, якім «давярае», Радаслаў Сікорскі заявіў, што Аляксандр Лукашэнка не перамог на прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі.

«Існуе верагоднасць таго, што Лукашэнка гэтых выбараў не выйграў. Паводле звестак, атрыманых намі ў пачатковай фазе выбараў [ад аўторка да суботы – Рэд.] было 30% галасоў, а ў нядзелю гэты вынік дасягнуў 40%. Гэта быў найлепшы вынік сярод усіх кандыдатаў, але не перамога ў першым туры. Чалавек, які перамог на выбарах, паводле афіцыйных звестак, з такім вялікім адрывам [79%, паводле ЦВК], не прымаў бы рашэння аб такім жорсткім разгоне апазіцыі, арышце праціўнікаў», сказаў Сікорскі ў інтэрв'ю «Газеце Выборчай».

У тэлевізійнай праграме «Кропка над і» міністр замежных спраў выказаўся яшчэ больш рэзка: «Паводле звестак з крыніц, якім мы давяраем, прэзідэнт Лукашэнка гэтых выбараў не выйграў».

Міністр замежных справаў Польшчы заявіў, што яна мае намер праводзіць тую ж палітыку ў дачыненні да Беларусі, як раней. — Палітыка ў дачыненні да Мінска была палітыкай абумоўленасці. Адказаў на жэсты і крокі Лукашэнкі ў кірунку лібералізацыі. Гэта не мы змянілі нашу палітыку, гэта Лукашэнка змяніў правілы гульні, растлумачыў Сікорскі.

Прэс-сакратар польскага МЗС паведаміў таксама, што ўчора ўранку Сікорскі меў «жорсткую» тэлефонную размову з міністрам замежных спраў Беларусі Мартынавым. У часе яе ён запатрабаваў неадкладнага вызвалення ўсіх затрыманых і арыштаваных. У тым ліку і тых, якія не ўдзельнічалі ў маніфестацыі, а былі затрыманы як дзеячы апазіцыі 20 снежня. Прэс-сакратар польскага МЗС адзначыў, што Сікорскі правёў кансультацыі па Беларусі з міністрамі замежных спраў Швецыі, Нямеччыны, з шэфам дыпламатыі ЕС Кэтрын Эштан, а таксама з Радай нацыянальнай бяспекі ЗША. Пасля гэтага ён абмяркоўваў беларускае пытанне з прэзідэнтам Польшчы Браніславам Камароўскім.

Учора ж з'явіўся зварот ветэранаў «Салідарнасці», у якім тыя заклікаюць свет быць з беларусамі ў гэты цяжкі для беларускага народа момант. Зварот падпісалі экс-прэм'ер Мазавецкі, журналіст Міхнік і іншыя знакавыя для Польшчы постаці.

**Сяргей Гезгала.**

# "ЛУКАШЭНКА ПРАЙГРАЎ"



Міністры замежных спраў Нямеччыны, Польшчы, Швецыі, Чэхіі апублікавалі супольны артыкул у «Нью-Ёрк таймс» пад загалоўкам «Лукашэнка прайграў». Сэнс: ніякіх больш размоў і ні цэнта грошай.

Пасля таго, што адбылося на прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі ў нядзелю, адносіны паміж Еўрапейскім Саюзам і прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам не могуць застацца ранейшымі.

У апошнія месяцы расла надзея, што ягоныя словы можна ўспрымаць сур'ёзна. Ён абяцаў запрасіць на выбары міжнародных назіральнікаў, і ён выканаў сваё абяцанне. Ён гаварыў пра пашырэнне прастору для дзеяння апазіцыі ў часе выбарчай кампаніі, і паляпшэнні былі.

ЕС адказаў прыпыненнем санкцый і шчодрай прапановай абумоўленага палітычнага дыялогу, эканамічнай супрацы і магчымасці фінансавай дапамогі. У інтарэсах і Еўропы, і народа Беларусі было працягваць у гэтым кірунку.

Пасля ўсё памянялася. Галасаванне адбывалася спакойна, але падлік галасоў ператварыўся ў фарс.

Справаздача незалежных назіральнікаў ацэньвае падлік галасоў як «кепскі» ці «вельмі кепскі» на той прыкладна палове выбарчых участкаў, якія яны ахапілі, і ёсць усе падставы меркаваць, што на рэшце ўчасткаў усё было яшчэ горш. Было відавочна, што ёсць загад не лічыць галасоў, а выдаць наперад вызначаны вынік.

Няма магчымасці даведацца рэальны вынік выбараў, але няма і сумневаў, што абвешчаны вынік не мае ніякай дэмакратычнай законнасці.

Мабыць, сп. Лукашэнка зразумеў, што ён не атрымлівае 50% галасоў, патрэбных для перамогі ў першым туры, і што яго чакае зневажальны другі тур супраць адзінага кандыдата ад апазіцыі.

Усе незалежныя экзіт-полы далі яму нашмат менш за 50% галасоў.

Але найгоршае здарылася пасля. Апазіцыйных кандыдатаў збілі, павалаклі і затрымалі. Былі схоплены сотні актывістаў. Суды канвеерам вынасілі прыгаворы, не падмацаваныя ніякімі фактамі. Ізноў з'явіліся палітвязні. Быў абвешчаны курс на рэпрэсіі.

Такога — такіх фальсіфікацый і такіх нахабных рэпрэсій — Еўропа не бачыла даўно. Тое, што Мілошавіч у 2000 годзе вырабляў у Сербіі, блякне перад тым, што робіцца ў Беларусі.

У памяці ўсплываюць хіба што параўнанні з увядзеннем ваеннага становішча ў Польшчы ў 1981 годзе.

Да чаго гэта прывядзе? Сілы падаўлення могуць атрымаць перамогу сёння, але раны грамадства ад гэтага не загояцца, і атачаны рэжым не вечны.

Перспектывы атрымання грошай ад Захаду для ўратавання ахавай эканамічнай сітуацыі развеяліся як дым. Інвестары не пойдуць у краіну, дзе так дэманстратыўна выказваюць пагарду да закона.

Еўрапейскі Саюз грунтуецца на каштоўнасцях правоў чалавека, дэмакратыі і законнасці. ЕС не будзе абыякава назіраць, як жахліва парушаюцца гэтыя каштоўнасці ў яго рэгіёне.

Працяг пазітыўнага дыялогу са сп. Лукашэнкам ў дадзены момант здаецца марнаваннем часу і грошай. Ён свой выбар зрабіў — і гэта выбар супраць усяго, за што выступае Еўрапейскі Саюз.

Але ў Беларусі ёсць шмат людзей, якія ведаюць, што час Лукашэнкі сыходзіць і ціха рыхтуюць лепшую будучыню.

Нашы кантакты з прадстаўнікамі розных сегментаў беларускага грамадства пераканалі нас, што Беларусь хоча быць часткай свабоднай і квітнеючай Еўропы.

Мы абавязаны зараз паглыбіць наша супрацоўніцтва з беларускімі дэмакратамі і тымі людзьмі ў кіраўніцтве краіне, якія не падтрымліваюць той фатальны курс, якім Беларусь пайшла. Іх нельга пакінуць, ім нельга здрадзіць у час, калі іх край уваходзіць у новы змрочны перыяд.

Найлепшы тэст для нашых каштоўнасцяў — гэта тое, што мы можам зрабіць для бяссільных. Еўропа не павінна быць нямой.

**Карл Більт, Гіда Вэстэрвэле, Радак Сікорскі і Карал Шварцэнберг** — міністры замежных справаў Швецыі, Нямеччыны, Польшчы і Чэхіі.

# Ператварэньне ў Чаўшэску

Зьбітыя і затрыманыя кандыдаты ў прэзыдэнты, шум плошчы, кроў на менскім сьнезе ... З палітыка, які заігрывае з Эўропай і гаворыць пра рэформы, які спрабуе супрацьстаяць расейскаму ціску, Аляксандр Лукашэнка зноў імкліва ператвараецца ў «апошняга дыктатара» старога кантынэнту. Мяркуючы па тым, што адбываецца, па-іншаму ўтрымліваць уладу ён папросту ня ўмее: чалавек, які прэтэндуе на асаблівую палітычную ролю народнага прэзыдэнта, панічна баіцца ўласнага народу.

**Камэнтар на апошнія падзеі ўМенскуўкраінскагааналітыка і аглядальніка Радыё Свабода Віталя Портнікава на сайце K2K News.**

Ня ведаю, ці можна зьдзіўляцца таму, што адбываецца ў беларускай сталіцы ў дзень прэзыдэнцкіх выбараў. У рэшце рэшт, так і павінна быць, калі ў цэнтры Эўропы палітык імкнецца ўтрымліваць уладу да бясконцасьці, мяняючы пад сябе законы і прымушаючы суграмадзянаў галасаваць за свой страх. Так і павінна быць, калі захаваньне ўлады Лукашэнкі - яго адзіная мэта і адзіная мэта ўсяго ўладнага апарату.

Аднак ужо ў панядзелак апарат - калі ня ўвесь, то прынамсі важная яго частка - задумаецца аб тым, наколькі мэтазгодна захоўваць уладу дыктатара, які старэе і страчвае хватку. Разгонам людзей на плошчы Незалежнасьці і чарговай фальсіфікацыяй выбараў Лукашэнка зноў пазбавіў сябе магчымасьці манэўру ва ўзаемаадносінах з Эўропай, зноў стаў закладнікам расейскіх кіраўнікоў, якія яго ненавідзяць. У Маскве ж заўсёды, калі Лукашэнка страчвае магчымасьць манэўраваць, пачынаюць актыўна дзейнічаць у кірунку дэмантажу самой беларускай дзяржаўнасьці і зьніжэньня аўтаноміі кіраўніцтва краіны. Гэта абсалютна нявыгадна Лукашэнку, але яму, можа быць, проста ўжо няма куды дзецца. І гэта нявыгадна ўсім, хто за ім стаіць, таму што ніхто з гэтых людзей ня хоча і ня будзе працаваць у адміністрацыі Беларускай фэдэральнай акругі. Так, і ёсьць яшчэ народ, які гатовы выходзіць на плошчы - і гэтых людзей нямала, іх усё больш. І сярод гэтага народу ўсё больш тых, хто вырас у Беларусі - маладых людзей, для якіх менавіта Беларусь - Радзіма, а не мітычны Савецкі Саюз або суседняя Расея.

Як ні дзіўна, любой беларускай эліце па дарозе з гэтым народам. А Лукашэнку - ужо не па дарозе. Ён можа ўтрымаць уладу яшчэ на нейкі час, але рана ці позна сутыкнецца з прыкрым адкрыцьцём: яго здадуць свае. Яны, а ня зьбіты падонкамі паэт Уладзімер Някляеў або іншыя апазыцыйныя актывісты - галоўная пагроза для «бацькі». Апазыцыянэры маглі б правесьці яго на ганаровую пэнсію. Свае - цалкам здольныя пасадзіць яго ў нейкі верталёт, які выбухне дзе-небудзь пад Жлобінам або даставіць прэзыдэнта ў месца хуткага, але справядлівага народнага суду. Аляксандар Лукашэнка, зрэшты, ніколі не паверыць у такі канец. Нікалае Чаўшэску таксама ня верыў у яго да апошняй хвіліны.

# ДЗЕ ПАЭТ НЯКЛЯЕЎ?

ТАКОЙ ІЛЖЫ МЫ НЯ ВЕДАЛІ НІКОЛІ Ў ГІСТОРЫІ, НАВАТ ПРЫ БАЛЬШАВІКАХ. ЗДАЕЦЦА, ШТО ЎСЁ ГРАМАДЗТВА ПАГРУЗІЛАСЯ Ў ЯЕ ЛІПКУЮ ТВАНЬ. ІЛГУЦЬ УСЮДЫ: ВА ЎЛАДЗЕ, НА ТЭЛЕБАЧАНЬНІ І РАДЫЁ, У КГБ І МІЛІЦЫІ, У ЦВК І НА ВЫБАРАХ, У АХОВЕ ЗДАРОЎЯ І Ў ДРУКУ, У ЮСТЫЦЫІ І СУДАХ. ІЛГУЦЬ ЦЫНІЧНА І НАХАБНА, НЕ МІРГАЮЧЫ І ГЛЕДЗЯЧЫ Ў ВОЧЫ.


(RFE/RL)

У сьвеце хлусьні чалавек траціць арыентацыю. Гэта якраз тое, чаго ніяк ня могуць зразумець людзі з Захаду, трапляючы на Ўсход. Нядаўна заходнія журналісты (што былі сьведкамі пабіцьця народу на плошчы Незалежнасьці ў Менску) перажылі цывілізацыйны шок, паслухаўшы на прэс-канфэрэнцыі галоўнага арганізатара і заказчыка гэтага злачынства, які выступіў у ролі абвінаваўцы. Тут якраз здарыўся той выпадак, калі заходнікі, якія былі там і самы бачылі тую рэчаіснасьць, пачулі на канфэрэнцыі перакручаны яе камэнтар у вульгарнай фразэалёгіі.

З "шоку" яны, відаць, яшчэ доўга ня выйдуць. Хаця сутнасьць зьявы вядомая. Фантан неадэкватнай некантралюемай хлусьні – гэта вынік скрыўленьня душы, псіхічнае збачэнства, кшталту клептаманіі. Асоба, якую апанавала хлусаманія, ня можа ня хлусіць, пра што б яна ні казала. У пабытовых дачыненьнях чалавек, што залежны ад хлусаманіі, траціць усялякую павагу ў асяродзьдзі. Аднак ён ня ў стане ўплываць на сваё асяродзьдзе. Калі ж такі суб'ект узносіцца на вяршыню некантралюемай аўтарытарнай улады (рэдкі выпадак), то хлусіць пачынае ўся ўлада. Яе хлусьня ўплывае на здароўе грамадзтва.

Увесь інтэрнэтны сьвет дакумэнтальна ў відэазапісах убачыў бандыцкае нападзеньне спэцназу на Ўладзімера Някляева ў час выбарчай кампаніі, бачылі ягоны цяжкі непрытомны стан, пабітую галаву і твар. І вось характэрны прыклад публічнай хлусаманіі: "Міліцыя зьбіла Някляева, ай-яй-яй, ай-яй-яй! – іранізуе Лукашэнка. -- Я знаходжу міністра аховы здароўя Жарко ўначы, кажу: "Васіль Іванавіч, я цябе пераканаўча прашу, пракантралюй, акажыце дапамогу. Ты ж разумееш, што смуроду столькі, што далей няма куды". Ён мне кажа: "Ды супакойцеся вы, там драпіна на патыліцы і сіняк пад вокам..." Някляеў рвецца на плошчу, бо там безь яго ўжо дзеляць уладу. Падзеі на плошчы скончыліся. Сабралі кансыліюм, яго накіроўваюць на амбуляторнае лячэньне. Тэлефануе мне міністар і кажа: "Ды мы яго са шпіталя вытурыць ня можам. Пад дзьвюма коўдрамі схаваўся". Знайшоў там адстойнічак, дзе вырашыў ціхенька адляжацца. Ня выйдзе!"

Ноччу з 19 на 20 сьнежня сем замаскаваных асобаў у чорным уварваліся ў палату рэанімацыі шпіталя хуткай дапамогі, дзе пад кропельніцай ляжаў зьбіты паэт Някляеў, вырвалі катэтары, кінулі паэта на бальнічную коўдру і павалаклі на ёй прэч. Да сёньняшняга дня (чацьвер, 23 сьнежня) невядома, што зь Някляевым, ці жывы ён і дзе ён знаходзіцца.

Чарговы ілгун рэжыму міністар унутраных спраў А. Куляшоў 22 сьнежня сказаў наступнае: "Затрыманыя былыя кандыдаты ў прэзыдэнты Андрэй Саньнікаў і Ўладзімер Някляеў абсалютна здаровыя, абсалютна нармальна, камфортна сябе адчуваюць... і знаходзяцца ў адпаведных месцах".

Наступны хлус паведаміў, што "адпаведнае месца" – гэта турма КГБ. І што быццам бы Някляеў там. Ускосна яно нібыта пацьвердзілася. Затрыманыя, якім рэжым заплянаваў "прышыць" крымінал, сапраўды знаходзяцца ў КГБ. Зь некаторымі ўжо бачыліся адвакаты.

Але ніхто ня бачыў Някляева, ніхто ня ўзяў яму перадачы, не дапусьцілі адваката. Той, хто ведае манеры лукашысцкага рэжыму і Лукашэнкі, разумее злавеснасьць такога становішча.

Беларусы мусяць дазнацца, дзе знаходзіцца выкрадзены рэжымам наш знакаміты паэт Уладзімер Някляеў. Яго ніхто не арыштоўваў. Супраць яго былі выкананыя крымінальныя дзеяньні: напад, зьбіцьцё і выкраданьне.

Дзе Някляеў? Гэтае пытаньне – усім уладным хлусам. Дзе паэт? У мяне падазрэньне, што тут нешта ня проста так. Мы памятаем, як (па-медыцынску) зьнішчылі ў шпіталі ў Бараўлянах вялікага Васіля Быкава. Калі з паэтам што здарыцца, то Вы, хлусы, ўсёй вашай чорнай крывёй ня змыеце ягоную кроў!

18 сьнежня быў закладзены Рух "За новыя выбары без Лукашэнкі". Працэс толькі пачынаецца. Трэба ўключацца ў гэтую справу. Але найпершая задача – гэта вызваленьне ўсіх арыштаваных у час пабоішча, арганізаванага рэжымам 19 сьнежня ў Менску, і прыцягненьне да крымінальнай адказнасьці правакатараў ды рэжымных арганізатараў пабіцьця людзей.

Фактаў дастаткова. Ёсьць фатаграфіі правакатараў і аўдыё-запісы іхных перамоваў па рацыі са спэцназам. Крымінальную справу трэба будзе адчыняць, але на лаве падсудных павінны сядзець ня тыя, каго зьбілі, а тыя, хто зьбіваў людзей, хто дэманстратыўна разьбіваў вокны ў Доме ўраду.

**Зянон Пазьняк.**

# ПРОВОКАТОРОВ ЗАЩИЩАЛА МИЛИЦИЯ

**Новые свидетельства: провокаторов было несколько сотен, они были пьяными, но милиция их отпускала.**

Как рассказал журналистам представитель штаба Виталия Рымашевского Вадим Кабанчук, с первыми провокаторами вечером 19 декабря он столкнулся уже на Привокзальной площади, где формировалась колонна БХД, около 19.00.

– Когда мы развернули свои флаги, то сразу же увидели около себя людей в подпитии, которые не имели вид «пацифистов». Нам удалось задержать нескольких человек и передать их сотрудникам милиции, – рассказал Вадим Кабанчук, отвечавший за охрану колонны БХД.

– На пути к Октябрьской площади наша колонна обрастала как нашими сторонниками, так и провокаторами. Когда мы подошли к Октябрьской площади, по нашим подсчетам в колонне насчитывались уже сотни провокаторов. Фактически все были в подпитии различной степени.

**Кандидаты в президенты на штурм Дома правительства не призывали, Рымашевский оттягивал от входа провокаторов**

Как отметила в своем блоге шеф-редактор «Народной Воли» Светлана Калинкина, во время шествия по проспекту Независимости к Дому правительства, провокаторы все же не смогли сделать несколько «картинок» для БТ.

– Например, в районе ГУМа на их пути стояли абсолютно «беззащитные» (в смысле, на первый взгляд, просто без людей) передвижные пункты обмена валюты – те самые автобусы, которые с центрального проспекта еще несколько лет назад убрали. Но вот надо же так совпасть, что именно в день акции случайно вновь подвезли!.. Народ, правда, к большому сожалению режиссеров, обошел аккуратненько эти автобусики, не покусившись на халявные и просто брошенные демонстрантам под ноги деньги, – отметила Светлана Калинкина.

Ответственность за события на крыльце Дома правительства представитель штаба Виталия Рымашевского Вадим Кабанчук полностью возложил на провокаторов.

– Я был очевидцем событий около Дома правительства. Во-первых, ни один из демократических кандидатов не призывал идти на штурм Дома правительства. Господин Санников сказал, что «мы идем на переговоры». Санников, Статкевич и Рымашевский подошли к ступеням здания. Но началось разбивание стекол людьми в подпитии, – рассказал он. – После того, как Виталий Рымашевский попытался оттянуть провокаторов от входа Дома правительства (это отчетливо видно на видеозаписи ниже – С.), началась первая атака спецназа. После нее процессом фактически уже никто не руководил. Говорить про ответственность демократических кандидатов за то, что там происходило, невозможно. Ситуация вошла в фазу бесконтрольности.

Многие очевидцы событий 19 декабря считают, что погромщиками являлись именно провокаторы, подосланные силовыми структурами, а не демократические активисты. «Салідарнасць» уже демонстрировала видео и фото, которые указывают на то, что провокации у стен Дома правительства готовились заранее. Вдобавок к этому читатель «Салідарнасці» обратил внимание, что на одном из видео зафиксирована странная сцена: когда омоновец повалил на землю человека из толпы около входа в Дом правительства, к нему подбежали люди в гражданской одежде с криками «НАШИ! НАШИ! НАШИ!». Омоновец сразу же отпустил задержанного (на видео эти события начинаются с 30-й секунды).

Политолог Ольга Абрамова заявила interfax.by, что общество должно получить ответ на вопрос кто в действительности являлся погромщиками у Дома правительства.

– Есть ли среди 600 задержанных те люди, изображения которых запечатлены в качестве штурмовиков? – задается вопросом Ольга Абрамова. – Это естественный вопрос, который возникает не только у политиков, но и у обывателей. Найдены ли непосредственные исполнители штурма известных дверей известного здания. Погромщики, кто они? Если они не находятся среди задержанных, почему их изображения не тиражируются и граждан не просят сообщить об этих личностях?

**Руслан Горбачев.**

# МУСІМ ЗМАГАЦЦА ЗА ЖЫЦЬЦЁ, ЗА ЛЁС КАНДЫДАТАЎ

"Першая ўмова, якая ставіцца ў дыялёгу з Беларусьсю, гэта вызваленьне ўсіх палітвязьняў і мараторый на палітвязьняў. Ня могуць быць палітвязьні, калі Эўразьвяз кантачыць з гэтай краінай. Гэта ўмова нумар адзін, а яна бясспрэчная", – сказаў госьць "Начной Свабоды" – лідэр руху "За свабоду" Аляксандар Мілінкевіч, які абвесьціў кампанію салідарнасьці з арыштаванымі ўдзельнікамі «Плошчы 2010».

Мілінкевіч: Ня могуць быць палітвязьні, калі Эўразьвяз кантачыць з гэтай краінай. Гэта ўмова нумар адзін, а яна бясспрэчная. Я зараз размаўляю з вамі і адарваўся ад кампутара і пішу ліст лідэрам Эўразьвязу пра падзеі, якія адбыліся, выказваю думкі пра тое, што трэба рабіць. І ў мяне пункт нумар адзін – вызваліць Мікалая Аўтуховіча і палітвязьняў, што сёньня сядзяць. А іх сотні. І перш за ўсё – гэта кандыдаты ў прэзыдэнты. Мы мусім змагацца за іх жыцьцё, за іх лёс. Маю надзею, што супольная салідарнасьць гэта можа вырашыць.

# Россия устами Жириновского

«Сейчас он, видимо, должен уйти, никакой инаугурации, он должен объявить новые выборы и сам в них не участвовать. Это было бы с его стороны единственно правильным шагом и подарком и белорусскому народу, и российскому». Так заявил вице-спикер Госдумы РФ Владимир Жириновский.

В интервью белорусскому телеканалу «Белсат» Жириновский даже выразил позицию всей России: «Медведев ни слова не сказал о Лукашенко. Сказал, что это выбор белорусов, пусть белорусы сами считают. Этими словами он сказал: Александр, я твои выборы не признаю. Мне стыдно за тебя и нам нехорошо с тобой иметь дело».

Вице-спикер Государственной думы России также недоволен тем, что Москва финансирует Александра Лукашенко. «Почему мы должны кормить Беларусь? Он врет, что это его достижения - каждый год мы ему по $5 млрд даем! Мы отрываем от наших граждан, - говорит Владимир Жириновский. - А сейчас еще будем и Украине давать. Ведь там украинский Лукашенко - Янукович».

Этот поток сознания можно послушать и посмотреть.

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў

**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742

**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна